Анатоль Кудласевіч

# Пераход

Амаль фантастычная аповесць

Андрэю Федарэнку, які падказаў тэму

1

Калі Антон Пракопавіч атрымліваў ганарар за чарговую кніжку і ставіў насупраць свайго прозвішча подпіс, то ледзь не плакаў ад крыўды. «І гэта ўсё? - выціснуў збялелымі і дрыготкімі вуснамі. «Усё!» - адказала бухгалтарка. Ён сарамліва схаваў грошы ў партфель і пачырванеў.
З выдавецтва выйшаў пануры: высокая постаць, здаецца, яшчэ больш сагнулася ад цяжкіх думак, што не давалі спакою апошнія гады. Ён ішоў, пастукваючы кульбакай па асфальце, сярод шумнага і мітуслівага людскога натоўпу. «Чаго толькі Ніцэвіч з Круцінскім там сядзяць? Аніякіх зрухаў, - скрушна думалася яму, - няўжо і яны нічога не могуць зрабіць?.. Загіне літаратура, калі не зменяцца адносіны да роднай мовы, да пісьменнікаў, да нацыянальнай годнасці!»
У старым заношаным гарнітуры, са скураным зашмальцаваным партфелем пад пахай і зацёртым да бляску капелюшы па вуліцы ішоў народны паэт рэспублікі, і цяжка было ўявіць, што ягоныя вершы перакладзены на дзесяткі замежных моў, што ўжо амаль паўвеку па радыё гучаць песні на ягоныя словы, што ў тэатрах рэспублікі ідуць яго п'есы, - настолькі непрыкметны быў ён сярод пярэстага натоўпу.
Цяжка дыхаючы, Антон Пракопавіч падышоў да лаўкі, змахнуў насоўкай пыл і прысеў адпачыць. «Гэта ж здзек з людзей! За гады бяссоных начэй атрымаць тры медныя грашы, - нудзіўся ён, - што на іх купіш? Разлічыцца з даўгамі - і па грашах?..» Тою ж насоўкай ён выцер узмакрэлы лоб, затым расшпіліў непаслухмянымі пальцамі пацёрты скураны партфель і дастаў чарнавік: звычайны школьны сшытак. Марудна рабіў падлікі, запісваючы лічбы слупочкам, час ад часу выціраючыся бруднай насоўкай (арыфметыка давалася яму цяжка яшчэ са школы), і калі, нарэшце, атрымалася на старыя грошы 160 рублёў

ганарару - не стрымаўся... Доўга ўздрыгвалі пахілыя плечы старога.

Потым ён падняўся і павольна рушыў далей, саступаючы дарогу рухавым маладым людзям, якія, здавалася, беглі навыперадкі з часам: «Можа, мы чагосьці не разумелі? - думаў Антон Пракопавіч. - Не так жылі, не пра тое пісалі? Верылі не ў тыя ідэалы? Можа, мы вінаватыя ў чымсьці? Таму і маем цяпер... Божа, - уздыхнуў цяжка і глыбока, - калі ты ёсць, за што караеш?..»

Па дарозе дахаты ён купіў дзве пары шкарпэтак, сем пачкаў танных цыгарэт, бохан хлеба, пакецік кавы і кілаграм цукру. Калі спускаўся ў метро, раптам пачулася песня. Спявалі па-беларуску. Антон Пракопавіч падышоў бліжэй, праціснуўся праз невялікі натоўп: каля сцяны сядзеў малады хлапец і спяваў пад гітару. І здалося старому паэту, што дзесьці бачыў ён раней гэтага хлапца, нават голас падаўся яму знаёмым.

Адзін у полі не воін,
Калі гэта поле чужое:
Стану ў полі адзін я,
Калі гэта поле - Радзіма!

Штосьці знаёмае пачулася Антону Пракопавічу ў словах песні, быццам ведаў ён калісьці гэтыя словы, ды забыў даўным-даўно.

Сюды я ступіў па следу
Бацькі свайго і дзеда,
І, зубы сцяўшы ад болю,
Сахою варочаў поле.

Як маланкай пеканула раптам: гэта ягоны верш! Так, гэта яго верш, напісаны калісьці ў юнацтве, адзін з першых надрукаваных: «Сюды я вясновым ранкам следам ступіў за бацькам...» - хлапец крыху перарабіў радкі, змяніў некалькі слоў, як кажуць, ступіў следам...

Мне сэрца надзея грэла,
Мне сонца было сяўнёю:
Душою сваёй і целам
Я зросся з гэтай зямлёю.

Співаў гітарыст. Міжвольна нахлынулі ўспаміны. Антон Пракопавіч адышоўся ўбок: скупа цяклі слёзы па схуднелых, апалых і маршчыністых шчоках.

У неба прасіў я долі,
У песні - для сэрца слоў:
На цяжкім, на родным полі -
Не жыта - жыццё ўзышло.
А поле на часткі крояць,
Дратуюць чужынцы зноў:
Дык станьце ж магутнай зброяй,
Нянавісць мая і любоў.

Калі хлапец скончыў спяваць, многія схіліся каля яго і пачалі нешта разглядваць. Падышоў бліжэй і Антон Пракопавіч, прыўстаў на дыбачкі, зазірнуў праз галовы і ўбачыў, што людзі разглядваюць кніжкі. Антон Пракопавіч праціснуўся праз натоўп і, толькі глянуўшы на зборнік вершаў, прызнаў хлапца - ім аказаўся Раман Росцік, той самы супрацоўнік часопіса, кандыдатуру якога на чарговае звальненне падказаў ён галоўнаму рэдактару, маўляў, малады яшчэ, знойдзе сабе занятак. Росцік падпісваў на памяць свае кніжкі, пакідаючы на вокладках арыгінальны подпіс «з галубком».
- Калі ласка! Без аўтографа не прадаецца. З аўтографам сем тысяч. Сем дзён у тыдні, сем цудаў свету, сем дзірак у галаве чалавека - усяго сем тысяч! Калі ласка, на вечную памяць, - і раптам голас яго напружана зазвінеў: - Грамадзяне незалежнай Беларусі! Побач з намі народны паэт рэспублікі, на яго верш я толькі што спяваў песню. Знаёмцеся, Антон Пракопавіч! - цяпер

людзі зацікаўлена паглядвалі на непрыкметнага дзядулю, які сціпла стаяў воддаль натоўпу, нехта нават запляскаў у ладкі, а ён неяк таропка, з вінаватай усмешкай заківаў галавой, нібы вітаючыся з усімі, і адразу заспяшаўся: «Дзякуй, дзякуй... Я тут, як і вы, - выпадкова...»

2

Ён крочыў да аўтобуснага прыпынку. Гледзячы здалёк, можна было падумаць, што за спінаю ў яго матляецца не гітара, а стрэльба, ды і сам Раман Росцік, як толькі рэмень ад чахла лажыўся на плячо, адчуваў сябе салдатам: унутрана падцягваўся, надзімаў грудзі і разводзіў у бакі плечы. Неяк сустрэўся ў трамваі са знаёмым празаікам.
- Ты як на вайну сабраўся: нібы аўтамат за плячыма, - пажартаваў той.
- Які ж гэта аўтамат? - пытаннем адказаў Раман, падхапіўшы гітару за грыф. - Гэта хутчэй мая вялікая лыжка, гітара мяне корміць. Чэрпаю гэтай лыжкай у людскіх сэрцах нектар з амброзіяй, каб свая душа на ладан не дыхала.
- Як ты сказаў? Паўтары, - з віртуознасцю фокусніка празаік выхапіў з кішэні нататнік і аўтаручку. - Цудоўны вобраз! Трэба запісаць.
Рамана заўсёды цешыла тое, што знаёмец занатоўваў пачутыя трапныя выразы і сакавітыя слоўцы, а можа, і зайздросціў, што сам не быў такі акуратны, сабраны і мэтанакіраваны. Не мог ён прымусіць сябе, як гэта рабіў празаік, пісаць кожны дзень па тры старонкі, а жыў, як і большасць паэтаў, «без рубля и без ветрил».
І вось гітара, дзякуючы жартаўлівай метафары, ператварылася ў рабочы інструмент і стала для яго, як для цесляра сякера.
Ён вынырнуў з метро на плошчы Якуба Коласа, агледзеўся і няспешна пайшоў у накірунку Камароўскага рынку паміж гандлярамі, што выстраіліся жывым вузкім калідорам усцяж вуліцы. Гандлявалі хто чым: гумкі, шкарпэткі, чаравікі і скураныя

турэцкія куртачкі, зімовыя футры і дзіцячае харчаванне... Хто скупляў жыллёвыя чэкі, хто прапаноўваў кватэру на суткі, а хто асцярожна шаптаў у патыліцу: «Даляры, эўра, маркі?...» Гандляры наперабой заклікалі пакупнікоў. Раней Раман няёмка адчуваў сябе на рынку: папросіць бабулька купіць яблыкі ці кветкі, а ён адводзіць вочы, нібыта сорамна ад таго, што непатрэбныя яму кветкі, нібы крыўдзіць чалавека, што не можа купіць. «Няма купіла», - няўдала жартаваў Раман і хутчэй сыходзіў. А чым ён вінаваты, што і сапраўды грошай ніколі няма, асабліва цяпер, калі страціў працу. Думалася, калі б ён быў мільянерам, падышоў бы да гэтай бабулькі, з учарнелымі ад калупання ў зямлі рукамі, і купіў бы ўвесь абярэмак рознакаляровых астраў, абы не пяклася старая на сонцы.

Доўга Раман адважваўся на тое, каб зарабляць грошы песнямі. Спачатку падгаворваў знаёмых бардаў, і яны з радасцю падхоплівалі ідэю «вольнай сцэны», згаджаліся выйсці з ім на вуліцу.
- Вось, хоць бы на вакзал, - падахвочваў Раман. - Уявіце, прыязджае чалавек у сталіцу, выходзіць з цягніка, а тут адразу песня на роднай мове. Можна танна набыць апаратуру, скласці праграму, абвесткі па горадзе расклеіць: значыць, сёння спяваюць Кім і Шуткевіч, той ці іншы паэт чытае свае вершы... Побач - выстаўка жывапісу: беларускія мастакі прадаюць карціны...
Але заўсёды знаходзіўся скептык і перапыняў Рамана: «Ага! Дадуць табе выступаць? Міліцыя адразу пагоніць!»
- Чаго гэта? - здзіўляўся Раман.
- На ўсё дазвол патрэбен! Плюнеш не ў тым месцы, і то цягнуць у пастарунак, а ты спяваць надумаўся на вакзале...
- Што ж, возьмем і дазвол, - не адступаўся Раман, - хіба гэта цяжка? Саюз пісьменнікаў пойдзе насустрач, напішуць паперу куды трэба. Так, маўляў, і так: прапаганда беларускай літаратуры. Зацвердзім дазвол у выканкоме, вызначым месца, час і, калі ласка, спявай на здароўечка! Скажы, што баішся,

раптам твае занудлівыя песні ніхто не стане слухаць? - абсякаў ён каго-небудзь з бардаў. - Тут толькі адважыцца, а там пойдзе як па масле... І кніжкі можна прадаваць, і касеты з запісамі песень і, - распальваўся далей Раман, - самае галоўнае, што ў людным месцы сталіцы будзе гучаць родная мова! А то ці многа людзей мы збіраем на вечарынах у Доме літаратара? Самі пісьменнікі ды іх жонкі. А вакзал за дзень тысячы людзей прапускае. У народ трэба ісці, да людзей...
Але далей звычайнай гаварыльні справа не рухалася, ідэя «вольнай сцэны» прабуксоўвала.

3

Часопіс, у якім працаваў Раман, паменшыў аб'ём, знізіў тыраж і, каб неяк пратрымацца на плаву, палову работнікаў рэдакцыя вымушана была скараціць. Трапіў пад скарачэнне і Раман Росцік. Амаль месяц прайшоў у пошуках новага месца працы - усё марна. Знайсці работу па душы - справа нялёгкая, а ісці абы-куды, толькі дзеля грошай, не хацелася. Ён шукаў такі занятак, які спалучаў бы ў сабе і заробак, і творчасць. Горш за ўсё было тое, што жонка сядзела дома з малым і дэкрэтных грошай хапала хіба што на хлеб ды малако. Да звальнення, маючы гарантаваны кавалак хлеба, смела абдумваліся рызыкоўныя праекты кшталту «вольнай сцэны», цяпер жа само жыццё штурхала на гэты крок. Колькі разоў, блукаючы па чыноўніцкіх кабінетах у пошуках працы, хацелася плюнуць на ўсе ўмоўнасці, узяць у рукі гітару, стаць у падземным пераходзе ці парку, кінуць на дол капялюш і заспяваць. Але адважыцца было цяжка. Дарэмна ён пераконваў сябе, што спяваць - такі ж занятак, як і ўсякі іншы, што нічога ганебнага няма, калі спяваеш за грошы, і чым, маўляў, адрозніваецца ганарар за публікацыі вершаў у дзяржаўных часопісах ад такога збору грошай у капялюш? Ніхто не заплаціць вулічнаму спеваку, калі песня не спадабалася, так што «капялюшны ганарар» прыстойна зароблены, сумленна і справядліва атрыманы. Штосьці стрымлівала Рамана, быццам

ён павінен быў пераступіць цераз самога сябе і стаць на адну дошку са звычайным жабраком.
Нечакана зразумеў: яго стрымлівае ганарлівасць, звычайная пыха, - як гэта ён, паэт, досыць ужо вядомы бард, пойдзе співаць на вуліцу?! Гандляваць сваім мастацтвам?! На якія толькі хітрыкі не пускаецца чалавечая самасць, каб апраўдаць бяздзейнасць і ляноту душы. Але ж і есці хочацца кожны дзень...
Вечарам, калі жонка адчыняла дзверы і са спадзяваннем лавіла яго позірк, Раман разгублена паціскаў плячыма, прыгаворваючы: «І сёння нічога няма!» Жонка апускала галаву, ішла на кухню. «Хоць бы выгаварыла набалелае, пагразіла разводам... Усё цярпліва пераносіць: ніводнага папроку... Але ж хіба я вінаваты, што нідзе не патрэбен, што не магу забяспечыць сям'ю?» Раману было крыўдна, балюча і сорамна. Нават старэйшы чатырохгадовы сын не выбягаў, як раней, з радасным крыкам насустрач: «Бацяня прыйшоў!» Не кідаўся з абдымкамі на шыю, не распытваў з непасрэднай дзіцячай цікаўнасцю: «Што прынёс? Што купіў смачнага? Ведаў: бацька беспрацоўны! І гэтае страшнае слова пужала малога невядомым сэнсам, быццам бацька яго горшы за ўсіх.
А ўчора падыходзіць і гэтак па-даросламу супакойвае: «Бацяня, не перажывай! Я вырасту, зараблю грошыкаў, і мы купім вялізны кавун і чатыры бананы: адзін табе, адзін маме і нам з брацікам па банану. - І з хітрынкай у вачах дадаваў: - Ты мяне потым яшчэ пачастуеш: малюпасенькі такі кавалачак ад свайго адломіш, а мама дасць браціку... У нас жа будуць грошы. Я ж зараблю!»
- Гэта ён сам прыдумаў? - паглядзеў Раман на жонку.
Яна толькі плячыма паціснула і неяк вінавата ўсміхнулася. Горкім раскаяннем у такія вечары турбавала пытанне: «Навошта было жаніцца ды яшчэ дзяцей заводзіць, калі не магу забяспечыць сям'ю самым неабходным?»
Той ноччу ён доўга не мог заснуць. Варочаўся на мулкім ложку з боку на бок. Некалькі разоў прачыналася жонка. Рашэнне выспела пад раніцу. Нервова паскладваў невялічкія зборнікі

вершаў у цэлафанавы пакет, сунуў гітару ў чахол, закінуў за спіну і выйшаў на вуліцу.

4

За апошнія гады Камароўка змянілася да непазнавальнасці. Як грыбы з вільготнай грыбніцы, павыпіралі вакол рынку розням магазінчыкі, кіёскі, ларкі ды шапікі. Усё радзей можна ўбачыць бабульку, што прадавала нейкія лішкі са свайго лецішча, усё больш сустракаліся гандляры, якія пагардліва і нават грэбліва глядзелі на пакупнікоў. Падыдзеш да такога - спытаць боязна, а раптам пачуеш: «Куды прэшся! Не бачыш, толькі за валюту прадаю!» - і, здаецца, аплявалі цябе з ног да галавы. Не чуваць на рынку болей вясёлага гоману, жартаў і смеху - людзі сталі халоднымі і злымі, часцей жа - абыякавымі, размеранымі, як зялёныя даляравыя купюры. Салоны шыкоўныя паадчынялі, супермаркеты - цяпер яны ўжо не спекулянты, а бізнесмены. Яны гаспадары жыцця, а ты хто? Зойдзеш у такі салон - усё зіхаціць, выблісквае пярэстымі ўпакоўкамі, страшна, каб не перакуліць што-небудзь, не зачапіць каго, а то і ў каршэнь пагоняць: адразу ж бачна па апратцы, што ў тваіх дзіравых кішэнях скразнякі гойсаюць. Раман пакрыху пачынаў ненавідзець добра апранутых людзей, усіх, хто хаваўся ў шыкоўных салонах, хто ва ўтульных кафэ наталяў смагу кактэйлямі і ахалоджанымі напоямі, усіх, хто меў шмат грошай і мог дазволіць сабе ўсё, што захоча. Ён хоць і разумеў, што такія адносіны да «багаценькіх» несправядлівыя, але не мог справіцца з пачуццямі. І, як здавалася Раману, ненавідзеў не за тое, што ў іх ёсць грошы, а за тое, што яны здзекліва пазіраюць на яго простае абтрапанае адзенне, і галоўнае, - думаў Раман, - яны прамянялі душу сваю і сумленне на шмоткі і баксы, таму і плююць з высокай званіцы на тыя прынцыпы, якімі жыве ён.
З такімі маркотнымі думкамі прайшоўся ён паміж гандляроў, шукаючы зручнае месца, прыслухаўся да размоў і раптам павярнуў назад да метро. «Не змагу я тут, - падумаў

расчаравана, - не хопіць духу. Хіба ім да песень, калі ў некаторых вочы пазелянелі ад даляравай прагі?»

Праз чвэрць гадзіны Раман выйшаў на прывакзальнай плошчы. Тут было вальней і дыхалася больш свабодна. Не кідаўся ў вочы валютны сверб, не мільгацелі даляравыя купюры. Калі і гандлявалі, дык толькі кветкамі, газетамі і здобнымі булачкамі. Хто сядзеў на сваіх клунках, чакаючы цягніка, хто ад няма чаго рабіць праходжваўся туды-сюды, не ведаючы, як змарнаваць час.

Колькі разоў у юнацтве, калі быў звычайным пасажырам, Раман даставаў гітару і пачынаў спяваць ці то на вуліцы, абапёршыся на сцяну, ці то ў зале чакання, прысеўшы на лаўку. А тут халадок падступіў да сэрца, і ён зноў спалохаўся. Агледзеўся, ці няма каго-небудзь са знаёмых. Падалося: усе адразу зразумелі, чаго ён сюды прыйшоў і што збіраецца рабіць, - сотні зацікаўленых позіркаў, здавалася, пранізваюць яго, сочаць за кожным рухам.

«Трэба адважыцца: што ж тады я за мужчына?! - Як марудна расшпільваецца маланка на чахле! Рукі не слухаюцца і дзынькаюць струны неяк не так... - Не, спачатку раскладу зборнікі», - падумаў ён і зашамацеў цэлафанавым пакетам, выкладваючы кнігі стосікам на кінуты перад сабой гітарны чахол. Спадылба зыркнуў па баках - некалькі чалавек, і праўда, пільна назіралі за ім. Доўга настройваў гітару, узяў некалькі пробных акордаў... Успомніўся жончын запытальна-цярплівы позірк, узгадаліся сынавы словы пра бананы, і Раман смела глянуў людзям у вочы і заспяваў. Адчайна і дзёрзка рванулася песня, быццам гітарыст рынуўся ў атаку на варожы бастыён. Голас узляцеў напружана, выбухнуў знянацку і рэхам адгукнуўся ў людскім натоўпе. Людзі пачалі азірацца, выцягвалі шыі, спрабуючы лепш разглядзець спевака. «А я жывы, яшчэ жывы!» - паўтараў ён кароткі рэфрэн пасля кожнага двухрадкоўя. Вочы заплюшчаныя, нічога не перашкаджае спеву. Нарэшце прагучаў заключны акорд, струны паціху замёрлі. Раман расплюшчыў вочы. Тры чалавекі стаялі каля яго і слухалі: два маладыя хлопцы, напэўна, студэнты, і стары дзед, апрануты ў лахманы,

відавочна бомж ці жабрак, які (ці не здалося гэта?) плакаў... Падбадзёраны першым поспехам, Раман праспяваў яшчэ адну песню, на гэты раз ціхую, спакойную і меладычную. Цяпер спяваў толькі для гэтых трох, вырваных з людскога вадавароту.
Жабрак перахапіў позірк, кіўнуў галавою і падміргнуў Раману, маўляў, не бойся! Адзін з юнакоў нагнуўся да зборніка: «Можна?»
- Калі ласка!
- Прадаяце?
- Так. Вершы! Вось гэтая песня, якую я толькі што праспяваў, на семнаццатай старонцы.
- Дык вы самі пішаце? Гэта ваша песня? - не верачы, спытаўся юнак. - Мне спадабалася. Я і сам крыху спяваю...
- Сам пішу і сам прадаю... Калі цікава, купляйце на памяць, я і аўтограф пастаўлю.
- А колькі яна каштуе?
- Пяць тысяч.
Юнак засаромеўся, напэўна, у яго не было і такіх грошай. Ён хутка паклаў кнігу на месца. Раману стала няёмка.
- Бярыце, бярыце! - прапанаваў ён, - вам як першаму пакупніку падпішу бясплатна... Сёння я ўпершыню адважыўся выйсці. Неяк трэба жыць... Ваша імя?
- Алесь, - адказаў юнак.
- Вось... «Алесю ад Рамана Росціка, надпіс вельмі просценькі: Менск, вакзал, пачатак восені... Зычу радасці і поспехаў!»
- Недакладная рыфма, - адзначыў нехта.
- Галоўнае, каб слова пацэліла ў яблычка. Дакладнасць паэзіі не ў гуках, а ў сэнсе, - пажартаваў Раман, працягваючы падпісаны зборнік.
- Мне няёмка, - запярэчыў хлапец, - я не вазьму.
- Я ж падпісаў для цябе! - перайшоў Раман на ты. - А калі не спяшаешся, то пастой побач: вельмі цяжка спяваць без слухачоў...
- А заўтра вы тут будзеце? - спытаўся хлапец. - Я грошы прынясу.

Ён узяў зборнік, доўга круціў яго ў руках, потым паглядзеў на Рамана, на фотаздымак на вокладцы, уздыхнуў: «Першы раз бачу жывога паэта...»
- Калі будуць цікавіцца зборнікам, скажы: аўтар прадае з аўтографам.
Раман заспяваў зноў. Усё больш і больш людзей прыпынялася каля яго. Калі скончыў чарговую песню, вакол сабралася ўжо чалавек дзесяць.
- Прадаю свае песні з аўтографам, - весела сказаў Раман, - можаце азнаёміцца...
«А колькі каштуе?» - цікавіліся з натоўпу. «Дык гэта вы самі пішаце?» - «І музыку, і словы?» - «А касеты з песнямі ў вас няма?» - сыпаліся з усіх бакоў пытанні.
- Касет пакуль няма, але хутка будуць... Збяру грошай, тады ўжо... А зборнік пяць тысяч каштуе, як пальцаў на руцэ, як пяць пачуццяў... Слухаць можна бясплатна. А вось кнігу бясплатна падарыць не магу... Патрэбны грошы і паэтам, каб напісаць свае санеты, і хлеб патрэбен.
- І сапраўды паэт, у рыфму гаворыць! - пачуўся здзіўлены голас.
- Добра спяваеш! - пахваліў мужчына, працягваючы пяцітысячную банкноту.
- Давайце, я аўтограф пастаўлю, - прапанаваў Раман, убачыўшы, што той хавае кнігу ў «дыпламат».
- О! Яшчэ і аўтограф! Цудоўненька. Няхай будзе на памяць, а то не паверадь.
- Як ваша імя? - пацікавіўся Раман.
- Маё?... Не, вы падпішыце на імя Агнесы, у яе сёння дзень нараджэння. Арыгінальны будзе падарунак, яна ў мяне любіць паэзію...
Раман падпісваў зборнікі адзін за адным і радаваўся поспеху. Ён не спяшаўся, было прыемна напісаць што-небудзь цёплае, каб сустрэча надоўга запомнілася чалавеку.
Не прайшло і дзвюх гадзін, як цэлафанавы пакет са зборнікамі прыкметна апусцеў. Пасля жывой рэкламы песняй паэзія хутка

знаходзіла свайго пакупніка. Адна дзяўчына раптам прынесла і паклала каля яго ног букет руж.
- Як твай імя, прыгажунька?
- Насця.
- У мяне пляменніца Насценька. Хочаш, верш пра цябе прачытаю? (Дзяўчына пацiснула плячыма і загадкава ўсміхнулася.) Тады слухай:

Не сядзіцца Насці ў хаце.
Дождж прайшоў па вуліцы.
Вельмі хоча забаўляцца,
Да матулі туліцца.
Буду слухаць цябе, мамка,
Не пярэчыць ані ў чым,
Толькі выйдзем на палянку,
Па сцяжынцы прабяжым.
Крок за крокам Насця скок,
Ой, як Насця рада.
На сцяжынцы чарвячок
Танцуе - «ламбаду»!

Дзяўчынка засмяялася. Усміхнуўся і Раман.
- Або, во, у Юрыя Антонава ёсць песня: «Птицы в небе щебечут: Настя, травы шепчут: А-нас-та-с-и-и-я» - праспяваў Раман.
- Я ведаю.
- Напэўна, хто-небудзь спяваў яе табе?
- Не-а, - коратка адказала дзяўчынка, пацiснула плячыма, крутнулася на адной назе, быццам выканаўшы складаны піруэт танца, і знікла.
Рамана радавала, што людзям падабаюцца яго песні: хто прыпыняўся на паўгадзіны, хто болей, а хто, купіўшы зборнік, спяшаўся па сваіх справах. Адзін чалавек спытаўся, ці не прадае ён гітару? «Не, - адказаў Раман, - вось вершы, душу сваю прадаю... Кажуць, чым больш аддаеш, тым болей застаецца...» Чалавек пацiснуў плячыма і пайшоў прэч, відавочна, ён не

зразумеў паэта. Дзесьці к абеду, зірнуўшы ў пакет, Раман убачыў - засталося толькі тры зборнікі і пашкадаваў, што мала ўзяў.
У гэтую хвіліну і падышоў доўгі, хударлявы, як жардзіна, хлапец. Барада яго неяк ненатуральна вытыркалася наперад, лез праз людзей нахабна, быццам усе яны былі штосьці вінаваты яму.
- Здароў! - працягнуў ён руку.
- Зда-роў, - насцярожана адказаў Раман. - Мы знаёмыя?
- Я Кіч - мяне ўсе тут ведаюць. А ты, бачу, раманы ціскаеш?
- Ды не... - усміхнуўся Раман, - я прозу не пішу... Вось песні спяваю, вершы прадаю.
- Ну і як гандаль? Забашляў многа?
- Ды крыху, здаецца, зарабіў...
- І пачым тавар? - яхідна спытаўся барадач.
- Трыццаць тры тысячы! - з выклікам выпаліў Раман.
- Ого! - самазадаволена прысвіснуў Кіч і загадаў: - Лады. Тады збацай «Таганку», ведаеш?
- Ведаць-то ведаю, але ж я толькі свае песні спяваю. Калісьці і блатныя спяваў, а цяпер вось сам навучыўся пісаць...
- Поет, значыцца... Добра. А я - кароль, і гэта ўсё маё каралеўства! - абвёў нахабнік рукою навокал. - Ёсць жа ў гэтага, як яго, Пушкіна «Поэт и царь»? Так што мы з табой калегі... І спяваеш ты песні на маёй тэрыторыі. Я тут за парадкам сачу, каб ніхто нідзе ніякае... Не бясплатна, канешне. Ну збацай «Таганку», каб душа раскрылася, а потым зноў на замок стопудовы.
- Ды не спяваю я чужых песень! - пачаў злавацца Раман. - Прынцыпова.
- Дарэмна, дарэмна... На прынцыпах далёка не паедзеш - адно калясо мае прынцып, а ездзіць трэба на чатырох.
Незнаёмец, што назваўся Кічам, дастаў цыгарэту «Мальбара», выкрасаў агонь шыкоўнай запальнічкай і зацягнуўся дымам, усмактаўшы адной зацяжкай ледзьве не трэць цыгарэты. Раману ён усё больш і больш не падабаўся.
- Ты вось тутака пра Бога спяваў. Дык ведай, у кожным раёне свой бог. А вакзал - мая парафія! Вось гэта ўсё, - ён абвёў рукой

прывакзальную плошчу, - мой прыход. Усёк? Я ўсім тут дапамагаю.
- Тво-ой? - перацвяліў Раман. - Купіў ты яго?
- Маё «купіла» вось тут вараціла! - прагундосіў Кіч і пастукаў сагнутым пальцам сабе ў лоб. - Сячэш?
- Не сяку і не збіраюся. Шукай дрывасекаў у іншых месцах, - пачаў раздражняцца Раман.
- З агнём іграеш. Напэўна, даўно галавой у футбол не гулялі? Малітвы трэба ўсялякія ведаць. Зарубі на носе...
- Ды ідзі ты адсюль! Хто ты такі, каб вучыць мяне? - чмыхнуў Раман. - Я да цябе ў душу не лезу і ты не лезь...
Кіч змераў Рамана з ног да галавы грэблівым позіркам і здзекліва пахмыльнуўся:
-Ты на маёй тэрыторыі бабкі збіваеш. Сячэш! А ўдзячнасці - нуль. Але твая праўда: час - грошы. Пайду і я працаваць.
Ён нагнуўся, падняў за край вокладкі зборнік, паглядзеў на кнігу праз святло, як звычайна робяць, калі правяраюць грошы на падробку, намагаючыся ўбачыць вадзяныя знак, і, не звяртаючы болей увагі на Рамана, паклаў зборнік у нагрудную кішэню, пстрыкнуў пальцамі і пайшоў.
- Эй! - толькі і паспеў крыкнуўць Раман, але Кіч не адрэагаваў - яго худое цела хутка растварылася ў натоўпе.
- Жардзіна! - сплюнуў Раман пад ногі.
Ён адчуваў сябе абражаным, быццам яму прылюдна наплявалі ў душу. Але хвілін праз дзесяць супакоіўся, маўляў, усякія людзі трапляюцца, што ж паміраць з-за гэтага? Прадаў апошнія два зборнікі, спакаваў рэчы і, закінуўшы гітару за плечы, пайшоў у прывакзальны гастраном. Доўга хадзіў каля стэлажоў, пакуль не набраў поўны цэлафанавы пакет прадуктаў, купіў бутэльку марачнага віна, цукерак і ажно два кілаграмы бананаў.
Акрылены поспехам, Раман радасна ехаў дахаты. Грандыёзныя планы мроіліся ў галаве. «Трудящийся достоин пропитания» - паўтараў старую ісціну Дабравесця, якая раптам выбліснула абноўленым сэнсам.

«Куплю магнітафон двухкасетны, запішу песні на касеты, так, абавязкова двухкасетнік, каб было зручна тыражаваць: пыталі ж людзі касеты? А потым замахнуся і на студыю...» - Засяродзіўшыся на такіх думках, Раман нават заспяваў напаўголаса ў аўтобусе: «Эх, любо! Любо, любо, братцы, жить! С нашим атаманом не приходится тужить». Старэнькая бабулька, што сядзела побач, падазрона скасавурылася на яго: ці не п'яны?

- Прабачце, настрой цудоўны, спяваць хочацца, - шчыра ўсміхнуўся Раман.

- Ад такога жыцця толькі спяваць застаецца, - разглядаючы ягоныя стаптаныя чаравікі і пашарпаную куртку, буркнула старая і адсунулася да акна.

Кнопку электрычнага званка націснуў і трымаў, пакуль жонка не адчыніла дзверы.

- Спадарыня, вам пакет! - махнуў Раман букетам чырвоных руж.

- Прасілі перадаць прыхільніцы вандроўнага паэта. А вось ён і сам уласнай персонай.

Старэйшы сын радасна падскокваў, прыгаворваючы: «Бацяня знайшоў работу! Бацяня прынёс падарункі! Цяпер мне не трэба спяшацца вырастаць, мой тата працуе».

- Жывём, славяне! - смяяўся Раман, раскладваючы на стале пакупкі.

Жонка ажно свяцілася радасцю.

- Я верыла, што ўсё будзе добра. У цябе верыла, - змахнуўшы слязу, усміхалася яна.

5

На рэдакцыйнай лятучцы галоўны рэдактар заўважыў, што Антон Пракопавіч не ў гуморы: сядзіць учарнелы, звесіўшы галаву. Не бярэ ўдзелу ў абмеркаванні тэматычнага плана, быццам ён тут чужы, трапіў сюды выпадкова і яго зусім не турбуюць часопісныя праблемы. Гэта было нязвыкла: заўсёды і першае, і апошняе слова было за ўплывовым літаратурным

аўтарытэтам. Галоўны рэдактар заўважыў перамены, што адбыліся з народным, і спытаўся:
- Антон Пракопавіч, вы часам не захварэлі?
- Не-не! Усё добра, - паспешна адказаў Антон Пракопавіч і разважліва дадаў: - Не звяртайце ўвагі. Пройдзе: звычайная зялёная туга.
З нядаўняга часу нешта быццам надламалася ў Антону Пракопавічу. Ніколі ён не адчуваў сябе такім спустошаным і вінаватым, як пасля сутыкнення ў падземным пераходзе з Раманам Росцікам. Здаецца, і не здарылася нічога асаблівага. Колькі людзей за жыццё прыходзілася звальняць з працы, і сумленне не зрабіла ніводнага папроку. Тут жа - толькі падказаў галоўнаму кандыдатуру, а быццам чалавека забіў. Некалькі начэй запар нават заснуць не мог. Упершыню адчуў, што не можа больш працаваць у рэдакцыі, што павінен саступіць, даць дарогу маладым. Як-ніяк, а ўжо пяць гадоў яму спраўна плацяць пенсію, не Бог ведае якія грошы, але вось Росцік спявае ў пераходзе, бо не атрымлівае нават гэтага.
Супакоіўся Антон Пракопавіч толькі ўчора пасля таго, як вырашыў напісаць заяву аб звальненні. Адстукаў тэкст на старэнькай партатыўнай машынцы, і здарыўся цуд, быццам камень з душы зваліўся, нават прасвятлеў тварам. Рэдка падабаўся ён сам сабе, такая ўжо было натура, але сёння, ідучы на рэдакцыйную лятучку, быў задаволены сваім учынкам. Заява ляжала ў скураным партфелі сярод іншых папер і прыдавала бадзёрасці. Пераступіў парог рэдакцыі і адразу ж упаў духам. Зноў падступілі сумненні: чвэрць стагоддзя аддаў ён часопісу, прырос да яго душой. Як жа яны будуць без яго і як ён без іх? Трэба было аб'явіць аб сваім рашэнні. Адразу не змог. Чакаў зручнага моманту, каб падаць навіну будзённа, каб ніхто не рабіў з гэтага трагедыі. І такі момант хутка надарыўся.
- На гэтым, шаноўнае спадарства, нашае паседжанне можна было б і закрываць, - падводзіў рысу галоўны рэдактар, - але ёсць адна закавыка. - Ён на хвіліну задумаўся, - ёсць пікантная акалічнасць. Учора мне зноў сказалі ўціснуць штат рэдакцыі.

Уяўляеце? Зноў уціснуць! Гаворка ідзе крута: быць ці не быць часопісу? Нас штурхаюць на самаакупнасць. Як можна параўноўваць літаратуру з прамысловасцю, з індустрыяй? Абсурд! Я спрабаваў, канешне, нешта там даказаць. Але дарэмна. Мяне не пачулі. Словам, трэба вызначыцца з кандыдатурай...

- Вызначацца не трэба! - амаль крыкнуў Антон Пракопавіч. Дрыжачыя пальцы ніяк не маглі справіцца з бліскучай металічнай зашчэпкай. - Вось! - нарэшце прамовіў ён і, з палёгкай уздыхнуўшы, адчыніў партфель, дастаў складзены напалам аркуш паперы, разгарнуў, разгладзіў яго рукой. - Няхай гэта будзе мая кандыдатура.

- Антон Пракопавіч, вы? - выдыхнуў галоўны рэдактар і адхіснуўся назад, усе здзіўлена пераглянуліся.

- Я! - цвёрда прагаварыў Антон Пракопавіч. - Рашэнне маё канчатковае. І даруйце, калі што не так. Пара, як кажуць, і гонар мець... Дый прыспеў час заняцца ўласнай спадчынай.

Ён працягнуў заяву галоўнаму рэдактару, - той узяў, пакруціў у руках, паклаў перад сабою, пабарабаніў пальцамі па стале і адсунуў заяву ўбок, затым ушчыкнуў двума пальцамі за край і паклаў на стосік папер з другога боку стала. У памяшканні павісла няёмкая гнятлівая цішыня.

Хто глядзеў у акно, хто на галоўнага рэдактара... Нехта моцна чхнуў, але ніхто не пажадаў яму добрага здароўечка. Сёй-той раптам пачаў корпацца ў сваіх рэчах, шукаць нешта ў кішэнях. А ў галаве Антона Пракопавіча, як шалёныя, круціліся аргументы, якімі ён збіраўся абвяргаць просьбы калег, каб застаўся. Але ўсе пераглядваліся і ніхто, нават галоўны, не стаў пярэчыць і адгаворваць, ніхто нават дзеля прыліку не заікнуўся, што на ім трымаецца часопіс, што ён увасабляе пераемнасць традыцый, і без яго рэдакцыя страціць той стрыжань, на якім усё трымаецца...

Усе маўчалі, быццам паадкусвалі языкі. І раптам Антон Пракопавіч зразумеў, што пытанне аб яго звальненні было ўжо даўным-даўно кімсьці вырашана, і ўсе гэта ведалі ды проста

чакалі, калі ж ён сам здагадаецца напісаць заяву. Чырвань кінулася яму ў твар.
- Усё! Дзякуй за працу, - папярхнуўся ён словамі: у горле стаяў камяк, - не памінайце ліхам.
Устаў, падхапіў пад паху партфель. Антон Пракопавіч ужо ўзяўся за ручку дзвярэй, як апамятаўся галоўны рэдактар і кінуў наўздагон:
- Не-не! Гэта вам дзякуй.
Але занадта позна ён прамовіў гэтыя, па сутнасці дзяжурныя, словы... Значыць, сказаў не сэрцам, а розумам, і не сказаў, а быццам стрэліў і не куды-небудзь, а ў спіну. Антон Пракопавіч павярнуўся, яшчэ раз папрасіў прабачэння ва ўсіх, каго пакрыўдзіў і каго яшчэ не паспеў... (жарт таксама пакінуў усіх абыякавымі) і - зачыніў за сабой дзверы. Ніколі яму не было так сорамна. Ён ведаў, што болей сюды, пакуль працуюць гэтыя людзі, ніколі не прыйдзе. Прыкра і брыдка было на душы.
А на вуліцы свяціла сонца...
Усё жыццё Антон Пракопавіч хварэў літаратурай, і аказалася, што за столькі гадоў працы не заслужыў нават простых слоў удзячнасці. Нават аднаго слоўца! Яны не адчулі ці не захацелі адчуць ягоных перажыванняў, а як жа тады пішуць? Няпраўда, што маўчанне - золата... Маўклівай згодай прадаецца самае святое ў чалавеку, з маўклівай згоды абыякавых пад сонцам дзеюцца самыя мярзотныя справы. Не будзе ў нас ні жывой літаратуры, ні высокай культуры, ні годнай дзяржавы - нічога не будзе, пакуль не навучымся гаварыць чалавеку патрэбнага яму слова...
Людзі на вуліцы смяяліся і радаваліся жыццю, спадзяваліся на лепшае... Лісце на дрэвах сям-там кранулася жаўцізной. «Эх, туга мая зялёная, зялёная туга...» - вырвалася з грудзей.

6

У маладосці Антон Пракопавіч лічыў, што з гадамі неўтаймоўная душа ўляжацца, саб'юцца вуглы супярэчлівага характару, усё

перамелецца жыццём, да ўсяго ён прызвычаіцца і не будзе болей крыўдзіцца на людзей. У сорак гадоў пачаў заўважаць, што сапраўды зрабіўся спакойны і разважлівы: холадна пераносіў і расчараванні, і радасці, і здрады сяброў. Але пад шэсцьдзесят душа быццам прачнулася ад доўгай спячкі, узарвалася вулканам, нібы спяшаючыся адгарэць полымем за адносна спакойны перыяд. Зноў яго, нібы юнака, балюча раніла неасцярожнае слова ці чыясьці няўвага, а то і проста незычлівы позірк. Таму ён цяжка перажываў трагедыю свайго зыходу з рэдакцыі, якая ўскладнялася яшчэ і тым, што цяпер ён стаў нікому не патрэбны: ніхто не званіў, ніхто не пытаўся пра здароўе і творчыя планы. Сапраўдных сяброў сярод пісьменнікаў Антон Пракопавіч так і не прыдбаў. Заставалася наракаць на самога сябе: ніхто ж не гнаў з рэдакцыі! Гэта мала суцяшала. Сам пайшоў, сам павінен і выйсці з тупіка, вырвацца з пасткі, у якую трапіў зноў жа па сваёй ахвоце.
Тыдні два ён сапраўды разбіраўся з будучай спадчынай. Слепячы вочы, вычытваў рукапісы, сёе-тое перадрукоўваў на машынцы, нешта парваў і выкінуў у сметніцу, а што-нішто скручваў, уціскаў і ўкладваў у вялізны мяшок. Паралельна з марнай працай ішло і непрыкметнае пераасэнсаванне пражытага і зробленага. Самаедства нічога добрага не дае. Так атрымалася, што гэтыя захады прывялі да кропкі, якую Антон Пракопавіч вырашыў паставіць на сваёй творчасці.
Ён напакаваў цэлы мех чарнавікоў, дзённікаў, так і не завершаных твораў, да якіх не дацягнуліся ні рукі, ні душа, - узваліў усё гэта на плечы і, каб ніхто не бачыў, выправіўся на далёкую пустку. Калі ішоў сюды, раптам успомнілася далёкае і зусім забытае...
Пачатак трыццатых гадоў. Калгасы бедныя, а самі калгаснікі яшчэ бяднейшыя. Сям'я ў іх хоць і невялікая, маці, ён ды малодшы брат, але працуе толькі маці. Бацьку забралі на службу ў войска... Гэта потым прыдумаюць паслабленне: жанатых з двума дзецьмі пазбаўляць ад вайсковай службы. А тады ўсё было інакш. Сена на ўласную кароўку не давалі: чым хочаш,

тым і кармі зімою. Вось і выправіліся яны з маці на калгасную сенажаць, каб там, насмыкаўшы са стога свежага сянца, увязаць у вязкі і прынесці пад покрывам ночы ў свой хлеў. Кароўка ж, яна ці калгасная, ці ўласная, а заўжды мыкае і кожны дзень хоча есці. Вяскоўцы гаварылі, што ноччу каля стагоў дзяжураць камсамольцы. Але маці не верыла: «От, будзе нехта апоўначы сядзець на полі? Брахня!» І праўда, спачатку было ціха. Насмыкалі сена спаднізу стога, каб не так прыкметнай была нястача, увязалі вяроўкамі вязкі, узвалілі на плечы і панеслі. Ужо да гумнаў падыходзілі, як раптам ад аднаго з дальніх стагоў хіснуўся цень і нехта гучна свіснуў.

- Кідай, Антонка! - крыкнула маці... - Бяжы ў гумны.

- А ты як жа? - спытаў ён у маці дрыготкім голасам.

- Як-небудзь... Бяжы хутчэй, ратуйся!

Антон скінуў цяжкую ношу з плячэй і рвануў да вёскі. Доўга і асцярожна прабіраўся да сваёй хаты, дзе агародамі, дзе прыціскаючыся да плота, прыпыняўся праз кожную пару крокаў і прыслухоўваўся. Дзверы ў хату адчыняў па сантыметры, каб не рыпелі. Святло не запаліў, распрануўся і лёг у ложак. Сэрца тахкала ў грудзях, як малаток. Ён не заснуў тады цэлую ноч. Маці прыйшла на дасвецці. Валасы растрапаныя, сама ўся скамечаная і, што яго вельмі здзівіла, у сіняках. Што здарылася там з маці, у начной цемені, ён ніколі не пытаўся. Але, відавочна, нешта жудаснае. Доўга яна хадзіла як не свая. У хуткім часе вярнуўся са службы бацька, пераступіў парог і ўсчалася сварка. Маці плакала, апраўдвалася... А праз некалькі месяцаў у іхняй сям'і нарадзілася сястрычка. Бацька яе ўзненавідзеў... Але менавіта з ёю прыйшлося яму дажываць свой век.

Антон Пракопавіч не мог дапяць, чаму цяпер успомнілася тое, як кралі з маці калгаснае сена, здаецца, ніякай сувязі з яго цяперашнім рашэннем? Толькі неўзабаве адчуў, што і зараз ён нешта крадзе... Ці ў самога сябе, ці ў людзей? На душы зрабілася пагана, але назад не вярнуўся, не адступіў ад задуманага.

Агонь расклаў у глыбокай лагчыне каля нейкай новабудоўлі. Доўга сядзеў і глядзеў на языкі полымя, перабіраючы ў памяці

жыццё. І паўставалі перад вачыма малюнкі былога, і мроілася ў галаве пражытае, і закручваліся ў тугія вузлы думкі. І быццам двое іх ужо сядзела тут каля вогнішча: адзін - вядомы пісьменнік са сваімі героямі, супярэчлівымі і прамалінейнымі, подлымі і прыстойнымі, з сотнямі такіх непадобных людзей, у якіх ён удыхнуў жыццё, а другі - той напужаны хлопчык, што дрыжыць пад коўдрай да самай раніцы і чакае сваю маці. Столькі жыццяў, здаецца, пражыта, столькім героям аддаў ён частку сваёй душы, прапусціў праз сэрца, што нават заблытаўся: што сапраўды было, а што выдумаў? І ці не раздарыў ён сваю душу, ці пакінуў хоць што-небудзь сабе? Што застанецца пасля смерці ўласна ягоным? І з чым душа паўстане перад Вечным Суддзёй? Цяжкія пытанні, непад'ёмныя...
Маўчыць зорнае неба над галавою. Маўкліва віхляюцца языкі полымя, ціха патрэсквае гарачае вуголле. Безгалосая цемра з усіх бакоў абступае хісткі агеньчык, у якім згараюць лёсы так і не народжаных герояў. Маўчыць ноч. Ніхто не дасць адказу.

7

Раніцай ён пералічыў адкладзеныя асобна папкі: паэзія, проза, драматургія... Усяго набралася восем папак з гатовымі творамі. Пазваніў сыну і папрасіў, каб той тэрмінова прыехаў. Сын спачатку аднекваўся, спасылаўся на занятасць, але пад вечар усё ж такі заявіўся:
- Што здарылася, стары? Чаму такая спешка? - незадаволена спытаўся з парога.
- Вось! - кіўнуў Антон Пракопавіч на раскладзеныя на падлозе папкі, - трэба ў інтэрнат прыстроіць.
- Што? - не зразумеў сын. - Ты кватэру надумаўся прадаваць?
- Калі ўсё пойдзе ладам, кватэра табе дастанецца, - пасміхнуўся Антон Пракопавіч, - я так Інтэрнет заву. І хто такую назву прыдумаў?
- Штосьці я не разумею цябе. Што ты хочаш?

- Хачу, каб ты маю спадчыну размясціў на якім-небудзь сайце ў Інтэрнеце. Няхай добрыя людзі чытаюць. Мне яно ўжо непатрэбна. І па рэдакцыях я болей бегаць не буду. Хопіць. Адбегаў сваё.
- Ты здурэў, бацька! Навошта табе Інтэрнет?
- Ну, не прападаць жа дабру?
- Там жа табе ні капейкі не заплацяць. Ды калі ўсё гэта надрукаваць - грашышчы якія! - сын поўзаў на каленях і перабіраў папкі, - і ўсё гэта падарыць? Старэчы маразм. Усё аддаць? Не! Ты, бацька, нешта не тое надумаў.
- Замаўчы, Сцяпан! - крыкнуў Антон Пракопавіч. - І не лапачы, як трындычыха. Я сказаў, па рэдакцыях хадзіць не буду, хопіць. Ніхто ў маёй справе ні на мезенец не дапамог, ні ты, ні твая пакойная маці. Усё сам. Колькі прасіў вас зрабіць хоць чарнавую работу. Ніводнага разу не дапамаглі. Затое колькі вы мелі з маіх ганарараў? Ты - трохпакаёўку, машыну, дачу... Твая першая жонка - кватэру і машыну. А ўнукі? Я ўсё цярпеў і рабіў так, як вы хацелі. А цяпер будзе так, як скажу я. А не паслухаеш, пасля локці грызці будзеш. Перапішу аўтарскія правы на перавыданні дзяржаве, або якой-небудзь апазіцыйнай партыі, або Дому састарэлых - ды каму заўгодна. І ты не атрымаеш ні капейкі. Зразумеў? Хопіць смактаць маю кроў і жыць паразітам. Бацька я табе ці не?
- Ну, бацька, бацька! Я ж слухаю...
- І гэтая двухпакаёўка табе можа не дастацца, калі не дапаможаш.
- Ну, бацька, я ж сказаў: усё зраблю. Толькі не разумею, што ты канкрэтна хочаш? У чым, так сказаць, твая бацькоўская воля?
- Вось гэта іншая размова. Пайшлі на кухню, у мяне пляшка ёсць. Вып'ем і ўсё дамазгуем.
Антон Пракопавіч дастаў з халадзільніка пляшку гарэлкі, адкруціў галоўку, як ён любіў жартаваць, «Двум буслам» і разліў вадкасць па шклянках, якія ўжо стаялі абапал вялікай фарфоравай талеркі, а ў ёй - парэзанае скрыдлікамі сала і каўбаска, вяндліна, агуркі і памідоры, раскладзеныя асобнымі

кучкамі, нават масліны акаймовачкай па краі. Не паскупіўся, хацеў уразіць сына.
- Дык ты, бацька, нядрэнна харчуешся, - пажартаваў Сцяпан.
- А што ў мяне грошай няма? Не зарабіў хіба за жыццё? Вось разлік нядаўна атрымаў, ганарар за кнігу...
Яны паднялі шклянкі, дзынкнула шкло. Выпілі. Антон Пракопавіч не закусіў і адразу пачаў гаварыць:
- Значыць, Сцяпан, хачу я ўсю спадчыну прыстроіць у Інтэрнет. Ты ў гэтым разбіраешся. Вось табе і карты ў рукі. Помніш, ты неяк гаварыў, што ў Інтэрнеце ўсё ёсць, што хутка кнігі зусім непатрэбнымі будуць, бо на адным дыску можна Оксфардскую бібліятэку размясціць, і ўсё такое... Вось і запусці ў сусветную павуціну мае творы, якія яшчэ нідзе не друкаваліся. Няхай людзі чытаюць.
- Вось цяпер, бацька, я цябе пачынаю разумець, - наліваў сваю шклянку сын. - Але ж гэта ўсё трэба набраць на камп'ютэры, а бясплатны, сам ведаеш, толькі сыр... Я ж не ўмею так хутка стукаць клавішамі, як ты.
- Не! Я і пальцам болей не дакрануся.
- Значыць, трэба шукаць машыністку, плаціць ёй.
- Праглядзеў я цебе, Сцяпан, - горка ўздыхнуў Антон Пракопавіч.
- Эх, праглядзеў! Жывуць жа людзі: дзеці ім апорай... - апусціў галаву на грудзі і колькі часу сядзеў, не гледзячы на сына. Затым, успомніўшы нешта, страпянуўся. - Пачакай, ты ж казаў, тэхніка такая ёсць, што адразу ўвесь тэкст пераздымае.
- Сканер?
- Во-во, ён самы, - пацвердзіў Антон Пракопавіч.
- Трэба падумаць, - сказаў сын і зноў выпіў гарэлкі.
Потым укінуў у рот масліну, выплюнуў на свой сподак костачку. Падняўся, пайшоў у пакой, прынёс адну папку, бухнуў яе на кухонны стол і дастаў некалькі лістоў.
- Я так і ведаў. Глядзі, водціск зусім слабы. Наўрад ці возьме сканер. Дарагі сканер патрэбен. І яшчэ невядома, ці машынапісны шрыфт прачытаецца камп'ютэрам.

- А так хваліў свае камп'ютэры... Навейшыя тэхналогіі... - з іроніяй сказаў Антон Пракопавіч. - А калі дайшло да канкрэтнай справы, то...
- Не хвалюйся, бацька, тэхніку знойдзем. Ёсць у мяне знаёмы, у яго ў офісе «жалеза» з усімі наваротамі. Але ж гэта ўляціць у капеечку.
- Колькі? - цвёрда спытаўся Антон Пракопавіч.
- Прыблізна тысяч... дзесяць.
- Ха! - выдыхнуў Антон Пракопавіч. - Хоць зараз! - і дастаў старамодны скураны кашалёк.
- Зялёных, бацька! Даляраў.
- Ого! - пахітаў галавой Антон Пракопавіч. - Кошт аднапакаёвай кватэры. Куслівая твая тэхніка.
- Ну, можа, і менш, я прыблізна сказаў. А колькі ў цябе ёсць?
- Колькі ёсць - усе мае, - сказаў, як адрэзаў, бацька і замаўчаў.
Сцяпан яго быў транжыра і гуляка, да таго ж чалавек не абавязковы: «Як яго прымусіць зрабіць справу? - думаў Антон Пракопавіч. - Ці сапраўды папрасіць каго іншага? Але ж чужы яшчэ хутчэй падмане, я ў гэтай тэхніцы зусім не разбіраюся». - А ўслых сказаў:
- Ну, калі твая фірма такая дарагая, я пашукаю танней, - сын насцярожана паглядзеў на бацьку.
- Што ты надумаў? - спытаўся і павярнуў галаву да акна.
- Як што? Мне трэба раздрукаваць усё на сайце: звярнуся ў камп'ютэрную фірму, дамоўлюся аб цане і людзі зробяць.
- Бацька, ну адкуль я ведаю? Я не займаўся сайтамі. Можа, гэта каштуе ўсяго тысячу даляраў.
- Бачыш, які ты? То дзесяць тысяч, то ўжо раптам тысячу. А калі патаргавацца, мо і сотні хопіць?
- Думаю, што не. Калі б яно ў цябе хоць набрана было на камп'ютэры. Як не возьмецца тэкст сканерам, гэта ўсё адно, што машыністцы за набор заплаціць. А тут лістоў дай Божа. А калі і возьме сканер, то ўсё адно не бясплатна. Загонім тэкст у камп'ютэр... Трэба ж неяк і афармляць? Зноў жа - не бясплатна.

А, магчыма, і за сам сайт, за плошчу ў Інтэрнеце трэба нешта плаціць. Я ж не ведаю.
- Во, бачыш. А то казаў: што хочаш раздрукоўвай у павуціне і ніякіх грошай за выданне.
- Бацька! Ды зразумей ты: адна справа аб'яву раздрукаваць ці паведамленне якое, а зусім іншая выдаць дзесяць тамоў Інтэрнет-выданнем. Трэба спачатку твае тэксты скінуць хаця б на сідзіром.
- А гэта што такое?
- Дыск такі, у якім можа змясціцца ўся твая бібліятэка.
- Ну дык скінь. Забірай папкі і скідвай туды. Я ўсё выпраўлю. Каб ніводнага слова, ніводнай коскі не мянялі. Гэта магчыма?
- Чаму ж не, там жа ніякай цэнзуры.
- Не можа быць! - прыўстаў стары.
- Вось табе крыж, хоць з мацюкамі друкуй.
- І што, ніякіх рэдактараў няма, ніякага кантролю?
- Няма!
- Тады ў тым Інтэрнеце сусветная памыйніца атрымліваецца! Усе туды свой бруд зліваюць.
- У прынцыпе так. Але ж ты вольны выбіраць на свой густ.
- А па-беларуску можна друкаваць?
- Па-беларуску? - здзівіўся сын і заківаў галавою, задумаўся. - Вось не ведаю. Трэба падумаць. Я штосьці не сустракаў. Так, дзве-тры фразы, але магчыма. Зрэшты, чаму б і не? Няма на тваёй роднай, значыць, будзе.
- Яна і твая, між іншым, - буркнуў стары.
- Бацька, не лезь у бутэльку... У павуціне ўсё ёсць, і ўсё павінна быць.
- Калі можна па-беларуску, то забірай папкі і дзейнічай. Давай за гэта і вып'ем.
- А грошы ёсць? - зноў спытаўся сын пра асноўнае; яго найбольш за ўсё турбавала, колькі бацька можа «адваліць» на гэтую справу?
- Ёсць у воўка поўсць, а грошы зарабіць трэба.
- Не прыбядняйся, стары, выцягвай заначку.

- Колькі трэба для пачатку?
- Ну... - сын задумаўся, прыкідваючы, якую назваць лічбу, - даляраў семсот павінна хапіць.
- Давай спачатку вып'ем, - разліў Антон Пракопавіч рэшту гарэлкі.
- А што, ёсць семсот?
- Пі, - загадаў бацька і, перакуліўшы сваю шклянку, захрабусцеў салёным гурком.
- Дык ёсць ці не? - дапытваўся Сцяпан.
Антон Пракопавіч пайшоў у пакой, зняў з кніжнай паліцы тоўсты даведнік, разгарнуў яго: пасярэдзіне кнігі ляжалі тры стадаляравыя купюры. Калі вярнуўся на кухню: сын уплятаў вяндліну, еў так, як быццам месяц галадаваў. «Нервуецца», - задаволена падумаў Антон Пракопавіч.
- Вось гэта ўсё, што ёсць, - паклаў ён грошы на стол.
Сын, глянуўшы на даляры, скрывіўся ў гідлівай усмешцы, было відаць, што ён разлічваў на большае: «Мала», - сказаў ён строга і бацька зразумеў, што на гэты раз Сцяпан не падманвае.
- Потым дам яшчэ. Абыходзься пакуль тым, што ёсць. Хутка кніга выйдзе... Ці якая іншая напасць. У выдавецтвах шмат чаго ляжыць ды па рэдакцыях. Проста болей не буду туды насіць. І пісаць не буду. Не напішу лепш. Усё, што ляжыць там на падлозе, - гэта маё апошняе слова. Пачакай, зусім забыўся, я ж атрымаў разлік.
Ён зноў знік у суседнім пакоі і праз хвіліну вярнуўся са жменяй беларускіх рублёў.
- Тут яшчэ на даляраў семдзесят пацягне.
- Усё адно мала, - чмыхнуў Сцяпан.
- Я ж кажу, што зараблю, буду дадаваць, а ты дзейнічай.
- Як жа ты будзеш зарабляць? Сам сказаў, што крыж паставіў на творчасці. Пенсіі табе хіба што на хлеб хопіць.
- Не твой клопат. Знайду чым зарабіць: галава на плячах ёсць.
Сын акуратна ўзяў стадаляравыя купюры і паклаў іх у пашпарт, потым згроб са стала беларускія зайчыкі і пачаў распіхваць па кішэнях. Нарэшце ён задаволена кракгануў: «Дзякуй, бацька».

- Ты не дзякуй. Я табе не падарыў. За работу заплаціў.
- Не хвалюйся. Зробім.
- А чаго мне хвалявацца. Гэта ты павінен хвалявацца. У мяне кватэра, і калі што-якое, яна табе можа і не дастацца. У мяне аўтарскія правы... Ведаеш, колькі ў мяне кніжак? Трыццаць чатыры асобныя кніжкі. Не лічачы збору твораў у сямі тамах. Так што бойся, Сцяпане, як бы гэтыя грошыкі ад цябе не сплылі ў якую-небудзь багадзельню.
- Цябе, бацька, як падмянілі. Я ўсё ж такі твой сын! - пакрыўдзіўся Сцяпан.
- Так-так, Сцяпане! Падмянілі. Век жыві, век вучыся, а дурнем памірай. А я не хачу дурнем. Хопіць таго, што дурнем пражыў. Хачу разумным памерці. З годнасцю. Як бы табе сказаць гэта, не ведаю толькі, ці зразумееш? Выспалася на табе прырода... Хачу зрабіць тое, што не зрабіў у свой час. Мне неабходна ўдыхнуць у сваіх герояў другое дыханне. Разумееш? Жыццё вышэй за літаратуру. Я заўжды ўважліва ўчытваўся ў пісьменніцкія біяграфіі. Калі мастак канчаў самагубствам, - яго літаратурныя героі, нават станоўчыя, мянялі свой зарад на адваротны, плюс на мінус. Бо гэта яны падвялі свайго творцу да гібелі, штурхнулі яго ў плечы на краі бяздоннай прорвы. Пакутніцкая смерць - гэта іншае, гэта ахвяра, а ахвяра - заўсёды подзвіг. Мне трэба падвесці рысу пад сваёй творчасцю, пад уласным лёсам. Тады апісаныя ў маіх кнігах героі і персанажы ўваскрэснуць. І будуць жыць доўга. Мастак заўсёды ахвяруе жыццём дзеля творчасці, ахвяруе часам, але ж ён атрымлівае і асалоду ад творчасці, як бы кампенсуе духоўныя затраты. У выніку зарад размагнічваецца. Мая ахвяра будзе крыху інакшай. І з Інтэрнет-выданнем. Хачу, каб апошнія мастацкія рэчы былі толькі маімі, каб не рваў па жывым, не крэсліў, не шкамутаў рэдактар маю душу, што выплавілася словамі, што пралілася слязьмі на старонкі твораў. Адзін чалавек - адно сэрца, адна душа. А бадай, уся наша літаратура хварэе крывадушшам. Выдыхне аўтар твор, прынясе яго ў часопіс, а рэдактар удыхне туды і свайго перагару,

або і зусім душу выб'е. А я хачу, каб апошняе маё слова было выдыхнутым, шчырым і засталося такім, якім прыйшло да мяне.

8

Сваёй уласнай бібліятэкай Антон Пракопавіч вельмі ганарыўся. Усё свядомае жыццё збіраў і купляў кнігі. Праўда, не хапіла цярпення пералічыць іх усе, хоць не аднойчы пачынаў заводзіць картатэку, але так і не перапісаў. Кніг было безліч: і шматтомныя выданні некалі папулярных серый, і зборы твораў, і славутыя таўшчэзныя энцыклапедыі, старыя манускрыпты, і зусім тоненькія брашуркі, рэдкія, што сталі рарытэтнымі. Увесь суседні пакой пасля смерці жонкі ён абсталяваў пад бібліятэку, кнігі займалі пяць стэлажоў ад падлогі да столі, зробленых некалі за тры дні запрошанымі цеслярамі. У кутку каля акна яны пакінулі невялікае месца для пісьмовага стала - так атрымаўся кабінет і бібліятэка. Па грубым прыкідзе, сабралася дзесяць-дванаццаць тысяч асобнікаў. Але навошта яны цяпер? Кнігі патрэбны, калі чалавек піша, бо добрыя кнігі здольны спараджаць сабе падобных, такія ж самыя кнігі, а калі на творчасці ставіць крыж, то кнігі не патрэбны. Вось так нечакана і знайшліся грошы на яго задуму.
Праз гадзіну Антон Пракопавіч ужо размаўляў з загадчыцай букіністычнага магазіна Зінаідай Сяргееўнай. Яна даўно ведала Антона Пракопавіча, цікавілася яго творчасцю і з радасцю ўзялася дапамагчы. Засмучала тое, што магазін браў кнігі на камісію, і грошы выплачвалі толькі пасля рэалізацыі адзін раз у месяц.
Наступным днём ён паклаў перад Зінаідай Сяргееўнай спіс выданняў, якія хацеў рэалізаваць праз магазін.
- Вы што, Антон Пракопавіч! Хто ж гэта купіць? - пляснула ў ладкі Зінаіда Сяргееўна.
- Штосьці не так? - здзівіўся Антон Пракопавіч.
- Вы прынеслі адных беларускіх аўтараў. Прабачце мяне, я разумею: вам непрыемна гэта чуць. Але рынак ёсць рынак. Ніхто

не купіць беларускія кнігі. Яны мала карыстаюцца попытам. З гэтага спісу два-тры аўтары, ну, можа, ваш сямітомнік пойдзе, - сказала яна, каб зусім не дабіць старога, - але гарантыі няма. Падбярыце даведачную літаратуру, зрэшты, энцыклапедыі добра ідуць. Іх і на расейскай, і на беларускай мове бяруць. Ну што-небудзь такое агульнаадукацыйнае, магчыма, слоўнікі.
На другі дзень Антон Пракопавіч прывёз паўнюткую валізку. Зінаіда Сяргееўна засталася задаволенай, і кнігі ўзяла. Пазваніўшы праз тры дні, ён даведаўся: купілі толькі гістарычную энцыклапедыю. Яшчэ праз дзень прадалі расейска-беларускі слоўнік. І тады Антон Пракопавіч вырашыў пайсці іншым шляхам.

9

- Кнігі! Кнігі! Беларускія кнігі, - ішоў па вагоне электрычкі ссівелы сутулы дзядок з велізарнаю сумкай цераз плячо і кульбай у руцэ.
- Ёсць Колас, Купала, Багдановіч... Цішка Гартны і Цётка, «Пінская шляхта» Дуніна Марцінкевіча... Кнігі, кнігі, беларускія кнігі!
- Извините, а Осфальд Шпенглер, «Закат Европы» у вас есть? - пачуўся маладжавы голас.
- Ёсць, але дома. Кнігі, кнігі з уласнай бібліятэкі. Беларускія кнігі.
- А детективчиков нет?
- Няма. Кнігі ў мяне толькі на роднай беларускай мове. Кнігі, - ішоў далей па вагоне стары, пастукваючы кульбай, і раптам прыпыніўся, вярнуўся на некалькі крокаў назад. - Прабачце, ёсць адзін дэтэктыў, праўда, ён болей для дзяцей, «Шчарбаты талер» Андрэя Федарэнкі.
- Покажите? О, так это на родном языке.
- Бяры, бяры, што ты сам как не родной, - засмяяўся хтосьці збоку.
- Ага, - разгарнуў кнігу мужчына, - скарбы напалеонаўскага войска... Добра. Вазьму. Колькі з мяне?
- Два даляры або па курсе.

- А чаму так дорага?
- Таму, што на роднай мове, - строга адказаў стары, і мужчына палез па грошы.
- Кнігі, кнігі на роднай мове, - засунуўшы грошы ў кішэню, рушыў кніганоша далей, - сучасная беларуская проза і паэзія, драматургія, класіка.
Антон Пракопавіч кожны дзень уставаў у пяць гадзін раніцы, загружаў вялікую сумку кнігамі і ехаў на вакзал. Там садзіўся ў электрычку «Менск-Баранавічы», або «Менск-Барысаў», ці «Менск-Маладэчна» і хадзіў з вагона ў вагон, прадаваў кнігі. Іншы раз паспяваў праехацца і па двух, а то і па трох маршрутах. За дзень стамляўся так, што не хапала сіл рыхтаваць вячэру. А раніцай зноў спяшаўся на электрычку.
Расейскамоўная літаратура добра разыходзілася і ў букіністычным, а вось кнігі на беларускай мове куплялі рэдка. Толькі аднойчы за паўгадзіны купілі каля сотні беларускіх кніг.
- Кнігі з уласнай бібліятэкі, беларускія кнігі! - аб'явіў па завядзёнцы і рушыў па вагоне.
Раптам насустрач паднялася жанчына сярэдніх гадоў:
- Антон Пракопавіч, вы? Я не памылілася?
- Я. Адкуль вы мяне ведаеце?
- А хто ж вас не ведае? Мы ж праходзім вас па школьнай праграме. Я тут не адна, нас сорак настаўнікаў з Лунінецкага раёна. Едзем на курсы ў Менск.
- А я, ведаеце, не пішу болей. На пакой сабраўся, - чамусьці пачаў апраўдвацца Антон Пракопавіч.
Праз хвілін пяць вакол яго сабраліся ўсе настаўніцы, яны з цікавасцю выбіралі кнігі, прасілі паставіць аўтографы.
- Ну, не магу я, любыя мае, ставіць свой подпіс на кнігу Дубоўкі ці Гаруна!
- А вы ўсё адно падпішыце, - не адступаліся настаўніцы. - Зразумела, што кнігі з вашай бібліятэкі і нам гэта прыемна. Мы і школьнікам сваім пахвалімся, што бачылі вас.
Такі выпадак, каб у адзін момант разабралі ўсе кнігі, здарыўся толькі аднойчы. Звычайна за дзень Антон Пракопавіч, ходзячы

па электрычках, аблягчаў сваю сумку ад сілы на кніг дзесяць-пятнаццаць. Можна, канешне, было б падладжвацца пад пакупнікоў і выносіць на продаж тое, што хацелі яны, і на расейскай мове, але кніганоша зацята прадаваў толькі беларускія кнігі. Гэтым, як яму здавалася, ён даказваў людзям, што беларуская мова жыве і будзе жыць!
З пэўнага часу Антон Пракопавіч прадаваў кнігі не дзеля грошай на Інтэрнет-выданне. Цяпер ён прынцыпова хадзіў ад электрычкі да электрычкі, ездзіў па ўсёй Беларусі, каб стаць жывым дакорам, папрокам і пратэстам. Каму? Ён ужо сам не ведаў: уладам, абставінам, усяму гэтаму свету, які намагаецца адвергнуць яго жыццё і творчасць толькі таму, што яго кнігі напісаны па-беларуску. І яму балюча было адчуваць, што ён патраціў свае гады ўпустую, што праз пяць-дзесяць, няхай пяцьдзесят гадоў літаратура на беларускай мове можа загінуць.
Некаторыя пазнавалі яго і выказвалі непадробнае здзіўленне: як так магло здарыцца, што ён, народны паэт рэспублікі, стаў кніганошам? У адказ Антон Пракопавіч толькі паціскаў плячыма і гаварыў:
- Я рабіў усё, што мог і як умеў... Магчыма, я памыляўся, калі дайшоў да такога жыцця. Вучыцеся рабіць лепш, па-іншаму.
Словы пісьменніка прымушалі думаць. Прыходзіў чалавек дахаты, - а па радыё гучала песня на словы Антона Пракопавіча. Уключаў тэлевізар, а там ішло кіно паводле ягонай аповесці... І паўставала перад чалавекам постаць паэта, якому няма дзе прытуліць галаву. І даставаў ён з паліцы кнігу, разгортваў яе, спрабуючы знайсці адказ на шматлікія пытанні. Павольна, як чорная хмара ў летнюю спякоту, шырыўся пратэст у душы: чаму мы так жывём? І куды ідзём? І што будзе з усімі намі, калі самыя лепшыя - ізгоі на роднай зямлі? І што пакінем дзецям сваім?...

10

Раніцай Раман з'ездзіў у «Музыку» - магазін, дзе можна набыць літаральна ўсё: ад медыятара да піяніна, і купіў новыя

сярэбраныя струны. Старыя абшарпаліся, а трэцяя крыху фальшывіла. Памяняў струны, доўга і акуратна настройваў іх і, запакаваўшы каля сотні зборнікаў у сумку, зноў паехаў на вакзал.
Гандаль у пераходзе пайшоў не адразу: за гадзіны дзве купілі ўсяго чатыры кнігі. Неяк падышоў добра апрануты мужчына і працягнуў пяць даляраў. Раман засаромеўся:
- Ведаеце, я не так... Я зборнікі свае прадаю. Вось, калі ласка, пяць тысяч.
- Я за песню даю. Малайчына, спявай!
- Дык на даляры ў мяне і рэшты няма.
- Дзівак, я за песню заплаціў, а зборнік куплю асобна... - працягнуў яшчэ пяць даляраў: - Бяры, і не думай нават, хіба ж гэта не работа - спяваць? За ўсё трэба плаціць! Ты вялікую справу робіш. Бяры, гэта не апошнія. Сакрат мог бы табе даць пяць даляраў? Не! Сам піў на чужыя грошы ды ад Ксанціпы хаваўся. Філосафы і паэты, сапраўдныя паэты, заўжды бедныя. Закон такі. Так трэба, напэўна. Хаця... Не, тут я памыляюся, проста для іх грошы - гэта смецце, што не ўяўляе ніякай каштоўнасці.
- Я згодны з вамі, - сказаў Раман, - але грошы патрэбны, каб не думаць, як пракарміць сям'ю, іх нястача адцягвае ўвагу ад галоўнага. А для мяне галоўнае: здзейсніць творчыя задумы, напісаць, напрыклад, новую «Вайну і мір».
- Крута бярэш! Для гэтага патрэбна мець Ясную Паляну, - засмяяўся пакупнік. - Так што не саромейся, раскладвай чахол ад гітары і няхай кідаюць. Нехта зборнік купіць, а нехта песні паслухае. Нічога ганебнага тут няма. Мякчэе душа ад тваёй песні.
Розныя людзі падыходзілі да Рамана, усялякія размовы здараліся паміж імі. Падышоў адзін такі і з нейкім зласлівым выклікам, быццам гадоў дзесяць шукаў Рамана, каб кінуць у твар яму гэтыя словы: «Ага! Што, БНФ падтрымліваеш?»
- Чаго гэта? - здзівіўся Раман. - Я сам па сабе... І ўвогуле лічу, што не справа паэта займацца палітыкай. Кожны чалавек робіць тое,

што добра ўмее рабіць, кожны павінен быць на сваім месцы. Мая палітыка - мае песні.
- Ведаем, ведаем... А чаго ж тады на беларускай мове спяваеш? Га? - ішоў у наступ незнаёмец.
- Я нарадзіўся тут. Што, мне па-гішпанску спяваць? Дык вы ж не зразумееце тады.
- Не зра-зу-ме-е-це. Ага! Сядзіш, брынькаеш тут на гітары, агітацыю развёў. Як піць даць, бэнээфавец! Знаем мы такіх... Мову яму падавай. Усе людзі як людзі, па-рускаму гавараць, а такія штосьці вышукваюць. Шпіён натаўскі, вось ты хто! І скоро мы всех вас к стенке поставім, очень скоро перестреляем как собак недорезанных.
- Кішдылах! - агрызнуўся Раман і дадаў па-нямецку, дакладна ведаючы, што гэты «паліглот» нічога не зразумее. - Геен нах шванц!
- А я что говорил, - агрызнуўся палітызаваны суб'ект, - вот ты и раскрылся! Скоро всех перевешаем на фонарных столбах! - плюнуў пад ногі і пайшоў прэч з пачуццём выкананага абавязку.

11

Мінула болей за месяц, як Раман упершыню выйшаў на вуліцу з гітарай. Шмат чаму навучыўся ён за гэты час. Ведаў, напрыклад, што слухачоў болей у сонечнае надвор'е. А яшчэ прыкмеціў, што людзі часцей прыпыняюцца, калі ў яго добры настрой, калі выкладваецца да апошняга. Вуліца тонка адчувае фальш.
Радавала тое, што «хаджэнне ў народ», як у думках называў ён канцэрты пад адкрытым небам, стымулявала творчасць. Бачыліся вынікі працы, нечакана адкрываліся новы тэмы. Узяць хоць бы пазаўчора: прычапіўся да яго мужчына «нападпітку» - усё спрабаваў пачаставаць то півам, то гарэлкай: «Давай, я збегаю. Весялей спяваць будзе!» - назаляў прыліпала і штурхаў у плячо.
Але сёння Раман прыдумаў, як бараніцца ад падобных тыпусаў: песня прываблівае, песня і абароніць:

Эй, грамадзянін, таварыш,
Спадар, ці як там вас?
Ты мне даляр падарыш
На піва, ці на квас?
Ці мо пляшку горкай -
Я песню прапяю
На просценькіх акордах
Пра маладосць тваю.

Калі падыдзе хто-небудзь такі, пакладу перад ім капялюш, нахабна ўперуся ў вочы і заспяваю:

Гарыць на небе зорка,
Гарыць, пакуль жывём,
Ды з просценькіх акордаў
Складаецца жыццё.
Эй, грамадзянін-таварыш,
Не вісні над душой!
Ну што, даляр падарыш?
Няма? То так пастой...

Учора было хмурна, збіралася на дождж і рэдка хто з прахожых прыпыняўся. Але раптам з натоўпу вынырнуў знаёмы твар паэта Шыніна: «Здароў, дзядзька!» - павітаўся ён. Спачатку здзівіўся, потым узрадаваўся, затым нейкі цень прабег па ягоным твары і, нарэшце, паспачуваўшы, што не купляюць зборнікі, захацеў дапамагчы рэкламай: расставіў шырока ногі і голасна закрычаў вершы. Людзі шарахаліся ад яго, хтосьці смяяўся, хтосьці глядзеў са шкадаваннем - настолькі вычварнай была поза натхнёнага паэта.
- Не трэба! Адно нашкодзіш такой рэкламай, - перапыніў яго Раман.
- Ды хіба ім патрэбна высокая паэзія? Ім толькі жэрці, жэрці і жэрці! - крычаў Шынін. - Яны - жывёліны! Яны - не людзі! Быдла!

Хіба яны здольны разумець мастацтва? Яны нават прагаласаваць самі не могуць...
«Як можна спрабаваць нешта пісаць з такой злосцю ў сэрцы», - разважаў Раман, калі Шынін нечакана знік у натоўпе. Людзі адчуваюць, калі іх не любіш, пагарджаеш імі, і адплачваюць той жа манетай. Сапраўднае мастацтва - гэта любоў. Трэба навучыцца любіць вось гэтую, апранутую ў брудныя лахманы бабульку, што сядзіць непадалёк, і таго самаўпэўненага бізнесмена, які паблісквае кейсам, мяркуючы, што ён гаспадар усяго свету і ўсё можа купіць, і вунь таго п'янтоса, што паваліўся каля бардзюрыны... Усіх трэба навучыцца любіць.
Сёння Раману не спявалася. Сядзеў, паклаўшы гітару на калені, і прадаваў зборнікі. Падышло некалькі чалавек, якія купілі вершы раней, прачытаўшы кнігу, яны чамусьці лічылі абавязковым пагаварыць з аўтарам: выказаць крытычныя заўвагі, адобрыць ці асудзіць. З'явілася і некалькі добрых знаёмых, што працавалі на вакзале: дзве чырванашчокія кабеты, якія гандлявалі бананамі, - адна з іх, Тома, як толькі Раман замаўкаў, бадзёра крычала здалёк: «Чаго сціх, пясняр! Спявай, весялей жыць!»; насільшчык, які разоў пятнаццаць за дзень папіхаў сваю каляску, то парожнюю, то нагружаную да самага верху чамаданамі, бауламі ды іншымі рэчамі, амаль штоpазу, праязджаючы міма, лавіў позірк Рамана і падбадзёрваў яго: «Або спявай, або грошы аддай!» Адзін раз пракандыбала між людзей і худая постаць Кіча.
Недзе а другой палове дня падышоў міліцэйскі патруль: ладны чарнявы вусач гадоў сарака з рацыяй на раменьчыку і два курсанты. Яны перасцярожліва акружылі Рамана: сяржант пасярэдзіне, а курсанты па баках. Сяржант, вусы якога былі заліхвацка закручаны ўгору, як у гарадскога прыстава мінулага стагоддзя, на правах старэйшага нешта запатрабаваў. Раман якраз спяваў песню і толькі па сяржантавым позірку зразумеў: у яго нешта пыталіся.
- Вы штосьці хацелі? - прыціснуў струны рукой.
- Дакументы! - строга запатрабаваў сяржант.

Раман працягнуў пашпарт. Узяўшы чырвоную кніжачку, патрульны нецярпліва пастукаў пашпартам па сваёй руцэ, нават не заглянуў у яго і раздражнёна прагаварыў: «Разрашэнне!»
- Што?
- Раз-ра-шэ-не на комерческую дзе-я-цель-насць! - па складах прадэкламаваў сяржант, даючы зразумець, што можа гаварыць зусім іншым тонам. - Парадак нарушаяце, гражданін! Песні паёце.
- Што я магу парушаць? І каму я перашкаджаю? Людзям падабаецца...
- Вы шчо ж, спрашвали? Можа, каму-та и не наравіцца? Такі парадак: все, занімающіеся, там купи-продай, і всё такое прочее, плацяць налогі гасударству. Иначай - нарушэнне. А нарушэнне карается законам. Вот счас забяром ва участак... Там паразгаварваем па-другому.
Раман, можа, і ведаў, што ад яго патрабуюць, але ніяк не хацеў зразумець і падпарадкоўвацца таму, што абавязваў закон: гэты ж закон пакінуў яго сям'ю безабароннай перад жорсткасцю жыцця.
Сяржант падняў зборнік, разгледзеў яго і разгарнуў: «Апяць нарушэнне?»
- А вы хіба нічога не парушаеце? - пачаў наступаць Раман. - На якой мове вы са мной размаўляеце?
- Я разгаварваю па-рускаму.
- І за што я павінен плаціць падаткі? Сам напісаў, сам выдаў, сам прадаю... Пры чым тут дзяржава? Я нават дапамогу па беспрацоўю не атрымліваю! Мне ж трэба карміць сям'ю. Я не спекулянт, як вашы бізнесмены! - Раман быў абураны, у голасе чуліся ноткі крыўды і адчаю.
- Што вы прычапіліся да хлопца, - крыкнула Тамара, - спявае - і няхай сабе спявае, весялей працаваць. Хадзіце лепей сюды - я вам па банану дам!
- Не паложана! - адрэзаў старшы патруля, і было незразумела: «Не паложано» спяваць ці есці бананы?
- А дзе ж паложана?

- Там, дзе ты не клаў. А дакладней, там, дзе мяне няма, - пачырванеў сяржант, - ідзі куды-небудзь далей ад вакзала, і там спявай, колькі ўлезе, - няпэўна паказаў ён рукой.
- Дык там знойдзецца другі служка, - не здаваўся Раман, - і скажа, што на яго ўчастку нельга!
Раманавы слухачы ацэньвалі сітуацыю: па іхніх рэпліках і выразах твараў ён зразумеў, што большасць на яго баку: «Паймалі злачынцу, ха-ха!» - «І не сорамна?», - чулася з розных бакоў.
- Вы лепш бы бандзюг лавілі. Прысталі да чалавека, - пачуўся жаночы голас.
- Гражданка, разбяромся без вас, - адмахнуўся ад яе сяржант і, працягваючы Раману пашпарт разам з кнігай, дадаў: - Незнанне закона не асвабаждае ад атветственасці. Мы прадупрадзілі. Дзелай выводы!
Чалавек пяць тут жа пачалі разглядаць зборнікі. Адзін хлапец даволі-такі нахабна, са словамі «дайце паглядзець» адціснуў убок сяржанта. Міліцыянеры пастаялі крыху дзеля прыліку і пайшлі далей. Раман падумаў, што на гэтым усё і скончылася, але праз паўгадзіны падышлі двое курсантаў.
- Вас жа папярэджвалі? Не разумееце? Забірайце кнігі - і пайшлі!
- Куды гэта?
- На кудыкіну гару. У пастарунак.
Раман няспешна пачаў складваць раскладзеныя на чахле кнігі ў сумку. Зачахліў гітару, закінуў на плячо... Але на гэты раз ён не адчуў сябе салдатам, а хутчэй ваеннапалонным. Падхапіўшы сумку з кнігамі, неахвотна паплёўся за курсантамі: адзін ішоў спераду, паказваючы дарогу, а другі прыстроіўся ззаду, напэўна, сачыў, каб Раман па дарозе не ўцёк.
У міліцэйскім участку за сталом сядзеў капітан, побач на лавачцы - ужо знаёмы Раману сяржант. На сценах, нібы ў салдацкай казарме, віселі ўзоры формы абмундзіравання і плакаты па страявой падрыхтоўцы. Як толькі Рамана ўвялі ў памяшканне, ён тут жа, не чакаючы запрашэння, прысеў на лавачку побач з сяржантам. Паставіў гітару паміж ног, а сумку

збоку. Сяржант паказаў на яго рукою і растлумачыў капітану: «Відзіш, какой шустряк, - кіўнуў у Раманаў бок, а потым афіцыйным, сухім голасам дадаў. - Этат гражданин порушает парадак. Цельны міцінг собрал в пераходзе. Песні без разрашэння спяваіт, кніжкі распрадает».
- Вы напраўду паэт? - паглядзеў капітан зацікаўленым позіркам, здавалася, ён не слухае, што гаворыць сяржант.
- Там на вокладцы мой партрэт.
- Партрэт і падрабіць можна, - усміхнуўся капітан, - нехта напісаў, а вы прадаяце... Чым дакажаце, што гэта ваша кніга? - круціў ён у руках зборнік.
Раман не мог зразумець: жартуе капітан ці не? «Калі ласка!», - расчахліў гітару і правёў па струнах. Тут жа на ўсю моц грымнуў песню, быццам яму дазволілі праспяваць апошні раз у жыцці.
Песня абарвалася гэтак жа нечакана, як і пачалася. Капітан усё яшчэ круціў у руках Раманаў зборнік, зірнуў у пашпарт, прыслужліва паднесены сяржантам і раптам усміхнуўся: «Хм, землякі. Я таксама са Столінскага раёна. Альшаны ведаеце?»
- Хто ж не ведае Альшаны? Гэта ж палескае «Габрава», - адчуваючы, што хмара прайшла, Раман усміхнуўся і напаўжартам дадаў: - Адно незразумела: чаго гэта вы землякоў прыцiскаеце?
Праз хвіліну Раман ужо спяваў пра палескіх казакоў. Паступова ўчастак напаўняўся людзьмі: спачатку прыйшла машыністка, потым - прыбіральшчыца, затрымаўся патруль, які прывёў Рамана. Усе здзіўляліся, што бачаць жывога паэта-барда, разглядалі зборнікі, звяралі прозвішча на вокладцы з пашпартнымі дадзенымі і, калі Раман скончыў чарговую песню, нехта пацікавіўся: «Колькі каштуе?»
- За сем тысяч прадаваў, - сказаў курсант, пасвятлеў тварам і з гонарам дадаў. - Гэта мы яго прывялі.
Спачатку адна рука, потым другая і трэцяя працягвалі Раману грошы, прасілі падпісаць кнігу. Праз нейкі час яго адпусцілі, сумка ў руках значна палягчэла. Капітан па-зямляцку папярэдзіў, што спяваць на яго ўчастку нельга. Вось каля аўтавакзала, калі

ласка - там другое аддзяленне: «Ты ўжо мяне не падвядзі!» - цiснуў ён напаследак руку i прасiў, быццам даўняга знаёмага.
Спяваць сёння болей не хацелася. Раман стаяў каля шыльды з раскладам цягнiкоў i дакурваў цыгарэту. Збiраўся ўжо нырнуць у метро i ехаць дахаты, як раптам з падземнага перахода, што вядзе да платформаў, чарговы патруль вывеў пад рукi Антона Пракопавiча: ён быў без шапкi... Раман пазнаў яго па нiзка схiленай сiвой галаве i па адмысловай, выразанай з грушы кульбачцы. Адзiн з патрульных iшоў ззаду i нёс на плячы цяжкую сумку. Раман пастаяў у нерашучасцi i пайшоў следам, трымаючыся на адлегласцi з дзесятак метраў. Патрульныя завярнулi ў знаёмы Раману ўчастак.
Яшчэ з калiдора ён пачуў, як старшы патруля дакладваў капiтану:
- Гаворыць, што народны паэт. Iмя вядомае называе. А сам кнiгi па электрычках прадае. Можа, аблапошыў каго-небудзь. Супрацiўленне аказваў.
Раман зайшоў у дзяжурку. Антон Пракопавiч сядзеў, панура схiлiўшы галаву, i маўчаў. Твар быў сцяты, губы сцiснуты, нiбы ад унутраннага болю.
- Таварыш капiтан! - кiнуўся Раман да свайго земляка. - Гэта сапраўды народны паэт, - i назваў прозвiшча.
- Не можа быць? - здзiвiўся капiтан.
- Мы працавалi разам.
- Дык вы ж былi ў Вярхоўным савеце i прымалi законы па якiх мы жывем? Як жа так атрымалася? - звярнуўся капiтан да Антона Пракопавiча.
- Вось так, - пацiснуў той плячыма, - атрымалася... Дзякуй табе, малады чалавек, - глянуў з удзячнасцю на Рамана.
- А шапка вашая дзе? - спытаўся капiтан.
Антон Пракопавiч моўчкi паглядзеў на старшага патруля, i капiтан усё зразумеў: «Ану-ка, мiгам на перон! Каб шапка была тут», - i той куляй выскачыў з дзяжуркi.
- Не карайце iх, - цiха сказаў Антон Пракопавiч, - не вiнаватыя яны. Нiхто не вiнаваты...

- Нейкая навала сёння, - узхдыхнуў капітан, - адны пісьменнікі... Вы нас прабачце, калі ласка! Я сваім скажу, каб не чапалі вас. Чуеце, хлопцы, - звярнуўся ён да двух патрульных, што падпіралі вушакі дзвярэй, - каб ніводнага воласа не ўпала з галавы гэтага чалавека. Вы хоць ведаеце, аболтусы, што гэта за чалавек!
І двое патрульных выпраміліся, расправілі плечы, рукі самі каўзануліся па швах, быццам перад імі сядзеў на лаўцы не сівы згорблены дзед, якому яны толькі што круцілі рукі, а прынамсі - генерал міліцыі.

12

Назаўтра на аўтавакзале да Рамана падышоў Кіч. Гэтак жа, як і ў першы раз, агледзеў яго са з'едлівай усмешкай і спытаўся з такой інтанацыяй, што Раман зразумеў: учарашнія прыгоды з міліцыяй былі не без удзелу гэтага суб'екта.
- Ну як, дапамаглі ўчора ўспомніць «Таганку»?
- А твая якая справа?
- Самая непасрэдная: «Таганку» не спяваеш, падаткаў не плаціш, ад даніны адмаўляешся...
- Ідзі ты адсюль!
- Толькі сам есці хочаш? Не, браток, за ўсё трэба плаціць. Крыўдуй на сябе! - загучалі ў голасе Кіча пагрозлівыя ноткі.
Раман рабіў выгляд, што не слухае яго: чалавекі чатыры чакалі зборніка, ён жартаваў, прыдумляючы імправізаваны надпіс, усім выглядам паказваючы, што ў яго ёсць больш важныя справы. І тут ён пачуў: нешта трэснула збоку. Азірнуўся - з лавачкі, на якой толькі што ляжала гітара, нехаця падымаўся Кіч.
Раман падняўся з уколенцаў, сціснуў кулакі. Каробка гітары была раструшчаная. Струны абвіслі. Ірвануўся было на яго з кулакамі, але на паўдарозе быў спынены апраўданнямі.
- Ой! - тэатральным жэстам ухапіўся Кіч за грудзі. - Прабач, братка. Не бачыў. Не хацеў, я незнарок... Я заплачу. Колькі яна каштуе? Вы ж бачылі, людзі, я нехаця... - шукаў ён падтрымкі ў прысутных.

Усе сурова маўчалі. Раман узяў гітару за абвіслыя струны, агледзеў яе, потым перахапіў рукою за грыф і хацеў сэкануць Кіча гітарай па галаве, але штосьці абарвалася ўсярэдзіне - адчайна, з унутраным болем кінуў саслабелай рукой гітару яму пад ногі:
- З'еш ты яе!
Жалобна ўскрыкнулі струны - і аціхлі.

Эпілог

...Гадзіны дзве ён цікаваў за міліцэйскім патрулём. Патруль коршакам наразаў кругі, паглядваў на яго здалёк, але не падыходзіў. І вось, нарэшце, яны падышлі ўшчыльную, сталі паўкругам.
- Давай, сворачівайся. Не положено!
- Чаму не паложана? Па якому праву?
- Не разгаварвай тут многа.
- Не, вы мне растлумачце. І не толькі мне. Растлумачце слухачам Беларускага радыё: чаму не дазваляецца спяваць песні на вуліцы? - і тыцнуў старшаму мікрафон.
Сяржант, убачыўшы мікрафон, рэзка адхіснуўся, быццам перад ім была галоўка кобры, і адразу прыставіў палец да вуснаў, даючы знак патрульным: «Маўчаць!» Міліцыянеры хуценька крутнуліся і растварыліся ў натоўпе.: «Што, інструкцыі не выдалі на такія выпадкі?» - засмяяўся ім наўздагон хлапец...